## Круглый стол

## «ЧЕЛОВЕК И ЯЗЫКИ»

**В. Б. Антоненка**

# ХОПІЦЬ КАЛІЛАСКАЦЬ, ЧАС ЗРАБІЛАСКАЦЬ: ПРА СУЧАСНЫ СЛЭНГ МАЛАДЫХ БЕЛАРУСАЎ

У выніку палітычных, эканамічных і сацыякультурных змен у краіне у моладзевым асяроддзі фармуюцца асаблівыя каштоўнасці і маральныя нормы, якія знаходзяць адлюстраванне ў мове. Часта моладзь выкарыстоўвае слэнг, які, з аднаго боку, ўплывае на развіццё мовы, а з другога – адлюстроўвае карціну свету сучаснай моладзі.

Крыніцамі матэрыялу нашага даследавання паслужылі 36 відэаролікаў з відэахостынгаў Ютуб і ТыкТок, адкуль з дапамогай суцэльнай выбаркі намі былі адабраныя 88 лексічных адзінак (ЛА) слэнгавай прыроды. Асаблівасцю гэтага этапу аналізу з'яўляецца наяўнасць малой колькасці стылістычна прыдатнага матэрыялу ў інтэрнэт-прасторы.

Асноўнымі спосабамі папаўнення слэнгу ў беларускай мове з'яўляюцца іншамоўныя запазычанні: 1) з ангельскай мовы – *саўнд* ‘музыка’, *вайб* ‘настрой’; 2) з рускай мовы – *гарлапаніць* ‘пець’, *годны* ‘якасны’; 3) з нямецкай мовы – *бан* ‘вакзал’; 4) з іўрыту – *жыць з мазаля* ‘жыць на грошы бацькоў’; 5) з ідыш – *ксіва* ‘пашпарт’ і г. д. Ужываюцца таксама словаўтварэнне і ўсячэнне на беларускай глебе: *гмыркацца* ‘злавацца’ *дзяўбала* ‘дурань’, *зацерабила* ‘надакучыла’, *шчэ* ‘яшчэ’. Прыкметнай з’яўляецца метафарызацыя: *пупок* ‘самазакаханы чалавек’, *калабок* ‘відэапаведамленне ў Тэлеграме’ і г. д.

Адабраныя ЛА былі падзеленыя намі на наступныя семантычныя групы: 1) субстантыўныя найменні рэчаў, з’яў: *нэт* ‘інтэрнэт’, *бусь* ‘пацалунак’; 2) найменні месца: *карламарла* ‘вул. Карла Маркса’; 3) характарыстыкі чалавека, у тым ліку нейтральныя, са станоўчай і з адмоўнай канатацыямі: *з нармалёвай групоўкі* ‘з добрай кампаніі’, *пупок* ‘самазакаханы чалавек’, *сцуль* ‘баязлівец’, *ноўнэйм* ‘невядомы чалавек’, *пяршак* ‘першакурснік’; 4) атрыбутыўная і працэсуальная лексіка: *стылёва* ‘прыгожа’, *даваць бусла* ‘цалаваць’, *шчабятаць* ‘размаўляць’, *рыхтык* ‘дакладна’, 5) эмацыйная лексіка: *трэш* ‘штосьці негатыўнае’; 6) этыкетныя словы: *дзяка* ‘дзякую’, *вітанкі* ‘вітаю’ і г. д.

Частотнасць ужывання слэнгавых ЛА, па нашых даных, вельмі розная: з 88 ЛА 30 сустракаліся толькі 1 раз, 49 – ад 2 да 5 разоў. Часцей за ўсё ўжываліся ЛА *ачмурэнны* (9 разоў), *падабайка* (21 раз), *вітанкі* (28 разоў).

Беларускамоўны моладзевы слэнг пачаў актыўна развівацца толькі ў апошні час, але ў яго ўжо ёсць свая спецыфіка. На наш погляд, беларускамоўны моладзевы слэнг не мае выразнай сацыяльнай афарбоўкі. Сёння выкарыстанне беларускамоўнага слэнгу ў паўсядзённым жыцці

з'яўляецца яскравым і дакладным спосабам самаідэнтыфікацыі. Вядома, слэнг як субстандартная форма не існуе асобна ад літаратурнай мовы, таму сам факт выкарыстання слэнгу маладымі беларусамі сведчыць аб тым, што беларуская мова жыве і развіваецца.